Дзённік сесіі

# СЕСІЯ ВЫХОДЗІЦЬ НА СТАРТ

Вясна — гэта радасць, добры настрой, шчырыя усмешкі. Адным словам, выдатная гэта пара года. Для студэнтаў жа вясна — адказныя выпрабаванні і вялікія хваляванні. Прыйшла сесія. А хто пры яе наступленні можа быць абыякавым і спакойным? Не, у гэтыя дні цяжка знайсці чалавека алімпійскага складу характара.

Экзаменацыйная сесія пануе думкамі і студэнтаў нашага універсітэта. Сёлета на ёй будуць трымаць справаздачу 3194 юнакі і дзяўчыны. Для 506 з іх наступае сама значная падзея — дзяржаўныя экзамены і абарона дыпломных праектаў. А неўзабаве Радзіма атрымае новае папаўненне маладых спецыялістыў з дыпломамі Гомельскага дзяржаўнага універсітэта.

Май — час сесіі. І па традыцыі «Ні пуху, ні пер'я» вам, дарагія сябры!





У новай чытальнай зале.

## НАШЫ ВЫНІКІ

Закончылася восьмая ў нашым жыцці студэнцкая экзаменацыйная сесія. Здадзены залікі і экзамены, і цяпер ужо можна гаварыць аб выніках.

Нягледзячы на тое, што семестр быў кароткім, а рыхтавацца да экзаменаў давялося ў святочныя першамайскія дні, агульныя вынікі сесіі нядрэнныя. Сярэдняя паспяховасць на нашым чацвёртым курсе склала 96,20 працэнта. Дзевяць студэнтаў здалі сесію толькі на выдатна. Чацвёркі і пяцёркі склалі 74,9 працэнта.

Лепшых поспехаў дабілася першая група, у якой шэсць чалавек атрымалі толькі выдатныя адзнакі — Анатоль Багамаз, Галіна Красніцкая, Наталля Хількевіч і іншыя. Прыемна адзначыць, што нашы выдатнікі актыўна ўдзельнічаюць і ў грамадскім жыцці факультэта і універсітэта.

Але, нягледзячы на такія, здавалася б, нядрэнныя паказчыкі, хочацца сказаць, што гэту сесію курс здаў горш, чым папярэднюю. На курсе многа здольных студэнтаў, але іх адказы не адпавядаюць магчымасцям юнакоў і дзяўчат. Яшчэ многа троек. Асабліва многа іх па дарвінізму і біяфізіцы.

**Я. ЛЯЛЬКОВА,**
**камсорг біёлага-глебавага факультэта, студэнтка 4 курса.**



## НАПЯРЭДАДНІ ПРАКТЫКІ

У эканамістаў трэцяга курса сесія ў разгары. 111 будучых спецыялістаў напярэдадні першай у гісторыі факультэта практыкі трымаюць адказ аб рабоце на працягу семестра. Асаблівасцю гэтай сесіі з'яўляецца тое, што студэнтам даводзіцца паказваць веданне спецыяльных дысцыплін: эканомікі працы, статыстыкі, эканомікі прамысловасці.

Вынікі экзаменаў неблагія. На курсе пакуль што адна нездавальняючая адзнака. Як заўсёды, выдатна адказваюць Міхаіл Ткачоў, Таццяна Іванова, Тамара Борсук. З пяці студэнтаў — камуністаў чацвёра здаюць экзамены на выдатна. Гэта Валерый Трухаў, Вячаслаў Наважылаў, Алена Чабаткова і Андрэй Ляшчынскі.

З вялікай адказнасцю адносяцца да сесіі камсамольскія і прафсаюзныя актывісты, старасты груп. Большасць студэнтаў разумее, што веданне спецыяльных прадметаў дапаможа ім у праходжанні практыкі на прадпрыемствах, вылічальных цэнтрах, навукова-даследчых інстытутах, з'явіцца базай для паспяховай работы ва ўсіх галінах народнай гаспадаркі.

**Наш кар.**

**НА ЗДЫМКАХ: праз некалькі тыдняў Валерый Касюк і Васіль Савіцкі (уверсе — справа) заканчваюць ГДУ. Студэнты-пяцікурснікі фізічнага факультэта заняты ў час работы над дыпломнымі праектамі.**
**Экзамен па філасофіі здае студэнтка 3 курса эканамічнага факультэта Э. Барадзіна.**

# ГЛЫБОКІЯ ВЕДЫ — ЗМЯСТОЎНЫЯ АДКАЗЫ

Два гады напружанай працы ў вывучэнні медыцынскіх дысцыплін засталіся ззаду. Студэнткі эканамічнага і гісторыка-філалагічнага факультэтаў паглыбілі свае веды па медыцынскай падрыхтоўцы.

Неабходна адзначыць, што для паспяховага засваення праграмы па падрыхтоўцы студэнтаў, калектыў супрацоўнікаў кафедры грамадзянскай абароны правёў вялікую працу па аснашчэнню вучэбнага працэсу наглядна дапаможнікамі. У прыватнасці створаны цудоўныя стэнды, транспаранты, макеты з электронным кіраваннем. У педагагічным працэсе шырока выкарыстоўваліся тэхнічныя сродкі — кіно, дыяфільмы, дыяпазітывы.

Да паслуг студэнтаў былі выдзелены вучэбныя базы: лепшыя лячэбна-прафілактычныя ўстановы горада. Усё гэта дазволіла паспяхова і поўнасцю завяршыць праграму медыцынскага навучання.

Зараз у разгары дзяржаўныя экзамены. Для падрыхтоўкі да іх у распараджэнне студэнтаў прадастаўлены спецыяльна абсталяваныя вучэбныя аўдыторыі кафедры. Тут жа праводзяцца кансультацыі.

15 мая студэнты эканамічнага факультэта першымі пачалі здаваць выпускны дзяржаўны экзамен. Неабходна адзначыць добрую арганізацыю самога працэсу экзаменаў. Для правядзення іх выдзелена адпаведнае памяшканне, падрыхтавана спецыяльная дакументацыя. На сталах выстаўлена спецыяльная медыцынская апаратура, прадметы ўходу за хворымі, плакаты. І вельмі шмат кветак, кветкі ўсюды. Гэта стварае святочную і ўрачыстую атмасферу. Экзамены праходзяць па-дзелавому, у спакойнай абстаноўцы, арганізавана. Трэба заначыць, што спазненняў і пропускаў няма.

І вось вынікі. Усяго дзяржаўны экзамен здавалі 80 студэнтаў-эканамістаў. Вынікі безумоўна радуюць: 38 выдатных адзнак, адказы 35 чалавек ацэнены адзнакай добра і толькі 7 — пасрэдных адзнак. Гэта надзвычай высокі паказчык: сярэдні бал 4,4.

Асабліва парадавалі экзаменатараў сваімі глыбокімі і змястоўнымі адказамі студэнткі Т. Белка, В. Курынчаніна, Л. Мартынюк, Л. Халецкая, Л. Аксёнава, Л. Будзько, Л. Кайдала, Л. Рыбіна, Г. Хількевіч, Л. Янкова, Е. Худчанка і іншыя. Імі па праву можа ганарыцца універсітэцкі калектыў.

Мы спадзяемся, што і студэнткі гісторыка-філалагічнага факультэта таксама пакажуць трывалыя веды, падтрымаюць добры пачатак сваіх сяброў-эканамістаў.

**В. ПРАХАСЬКА,**
**старшыня экзаменацыйнай камісіі.**





**На здымках: ідзе дзяржаўны экзамен (злева). Студэнтка 2 курса эканамічнага факультэта Н. Мільчанка на практычных занятках.**

